# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 14 мая 1998 года, чацвер, № 8 (1781)


ЮБІЛЕІ

## КАФЕДРА, СТАРЭЙШАЯ ЗА ФАКУЛЬТЭТ

***Нядаўна кафедра тэарэтычнай фізікі фізічнага факультэта БДУ святкавала сваё 60-годдзе. З гэтай нагоды ў галоўным корпусе БДУ адбылося ўрачыстае пасяджэнне. Супрацоўнікаў кафедры віншавалі яе шматлікія сябры, выпускнікі, калегі з іншых гарадоў Беларусі.***

Нагадаем, што ў 1922 годзе на педагагічным факультэце БДУ было адкрыта фізіка-матэматычнае аддзяленне, у 1933 годзе яно было рэарганізавана ў факультэт. У 1938 годзе на факультэце былі 4 фізічныя кафедры — у тым ліку і кафедра тэарэтычнай фізікі. Цікава, што сам фізічны факультэт на 20 гадоў маладзейшы за кафедру — ён быў створаны толькі ў кастрычніку 1958 года пасля падзелу фізіка-матэматычнага факультэта.

Кафедра тэарэтычнай фізікі была арганізавана па ініцыятыве доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Заслужанага дзеяча навук БССР, акадэміка Фёдара Іванавіча Фёдарава. Ён кіраваў кафедрай на працягу 24 гадоў і сапраўды стварыў у Беларусі вялікую навуковую школу па тэарэтычнай фізіцы. Дарэчы, Фёдар Іванавіч стаў першым доктарам фізіка-матэматчных навук у Беларусі. Ягоная жонка Рына Аляксандраўна Фёдарава, якая таксама прысутнічала на святкаванні юбілея, не так дзўно перадала кафедры ў дарунак вялікую навуковую бібліятэку мужа.

З 1962 года кафедру ўзначальваў прафесар А. Я. Левашоў. З 1973 — тады дацэнт, а цяпер прафесар Л. І. Камароў. А з 1983 года і па сённяшні дзень ёй кіруе доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Леанід Матвеевіч Баркоўскі. На сёння кафедра тэарэтычнай фізікі мае ў сваім штаце 7 дактароў фізіка-матэматычных навук і 8 кандыдатаў навук, працуе ў шчыльным узаемадзеянні з многімі лабараторыямі ІФ НАНБ і іншымі акадэмічнымі інстытутамі, Нацыянальным цэнтрам фізікі часціц і высокіх энергій, лабараторыямі НДІ ЯП і НДП ПФП. Кафедра тэарэтычнай фізікі ўдзельнічае ў міжнародных канферэнцыях, падтрымлівае шчыльныя навуковыя стасункі з універсітэтамі і навуковымі ўстановамі іншых краін. Штогод кафедра выпускае каля дзесяці спецыялістаў у галіне тэарэтычнай фізікі. Пачынаючы з пяцідзесятых гадоў на кафедры падрыхтавана звыш 80 кандыдатаў навук, з іх каля 60 за апошнія дваццаць гадоў, у тым ліку каля 20 кандыдатаў навук для краін далёкага замежжа.

Ганаровымі граматамі Белдзяржуніверсітэта ў гонар юбілею кафедры былі ўзнагароджаны прафесар Л. А. Барысаглебскі, прафесар А. В. Мінкевіч, дацэнт Я. А. Ушакоў, граматамі — прафесар А. К. Гарбацэвіч, дацэнт М. М. Полазаў, дацэнт А. М. Саладухін. Рашэннем рэктара БДУ кафедры тэарэтычнай фізікі ад імя універсітэта быў падораны камп'ютэр. Прыемным сюрпрызам быў падарунак і ад дэканата фізічнага факультэта — музычны цэнтр.

*Таццяна КУХАРЧУК*

ДОШКА АБ'ЯЎ

**Прывітанне, Вязынка!**

**Студэнцкі саюз Белдзяржуніверсітэта запрашае ўсіх жадаючых на традыцыйны студэнцкі фестываль "Белдзяржуніверсітэт-98", які адбудзецца 16-17 мая ў Вязынцы.**

**У праграме плануюцца конкурс візітовак факультэтаў, конкурс паходнай кухні, міні-футбол, перацягванне каната, гіра, спартыўнае арыентаванне, армрэслінг, прэс-канферэнцыя з адміністрацыяй БДУ, аўкцыён, дыскатэка да світанку.**

ВЕСТКІ З ГАЛОЎНАГА КОРПУСА

## Кампакт-праект у дзеянні

Як паведамілі карэспандэнту «Беларускага універсітэта» ва Упраўленні па міжнародных сувязях БДУ, на базе БДУ і Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы прайшоў семінар «Кіраванне міжнароднай дзейнасцю ў вышэйшай навучальнай установе».

У мерапрыемстве прынялі ўдзел каля 30 кіраўнікоў міжнародных служб розных ВНУ Беларусі.

Акрамя таго, сярод удзельнікаў семінара быў кіраўнік службы міжнародных сувязей Йенскага універсітэта доктар Ю. Хендрык (Германія), прысутнічаў прадстаўнік універсітэта Гранады доктар Карлас (Іспанія).

Семінар ладзіўся ў мэтах кампакт-праекта БДУ «Распрацоўка нарматыўных дакументаў па арганізацыі міжнароднай дзейнасці ў галіне вышэйшай адукацыі Беларусі». Удзельнікі семінару абмеркавалі шэраг праектаў дакументаў. У прыватнасці, «Прыкладнае палажэнне аб міжнароднай дзейнасці ў вышэйшай навучальнай установе», «Прыкладнае палажэнне аб службе міжнародных сувязяў ВНУ», «Палажэнне аб Міжведамаснай камісіі па міжнароднай дзейнасці ў сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь», «Палажэнне аб навучанні ў Рэспубліцы Беларусь замежных грамадзян і асоб без грамадзянства».

## Падпісана рабочая праграма

На пачатку красавіка падпісана рабочая праграма супрацоўніцтва паміж Белдзяржуніверсітэтам і Йенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (Германія) на 1998—2000 гады.

У межах праграмы прадугледжваецца абмен студэнтамі, выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі, сумесныя навуковыя распрацоўкі ў галіне фізікі, матэматыкі, гісторыі, філалогіі (славістыкі, права, філасофіі).

ВЫ ЧУЛІ?

## Пасадзі сваё дрэва

Суботняй раніцай 25 красавіка ў розных кутках Беларусі моладзь саджала дрэвы. Прычынай такога тэрміновага і шырокамаштабнага азелянення мясцовасці стала акцыя "Алея БСМ", арганізаваная Беларускім саюзам моладзі.

У Мінску месцам пасадкі стаў парк Лошыца, дзе была пасаджана незлічоная колькасць дэкаратыўных кустоў (у тым сэнсе, што іх ніхто не лічыў). Калі быць больш дакладнымі, хлопцы і дзяўчаты зрабілі на схіле прысады даўжынёй каля 15 метраў. Пад наглядам дырэктара парка Яўгена Георгіевіча Церахава пасадзілі ўсё кваліфікавана. Але гэтым не абмежаваліся. Расчысцілі яшчэ падыходы да мясцовай сажалкі і пазбіралі навокал смецце.

Апошнім часам Беларускі саюз моладзі дзейнічае ўсё больш актыўна. У яго планах арганізацыя ў Нясвіжы з 2 па 16 жніўня экалагічнага лагера "Альба-парк". Дзейнасць лагера будзе скіравана на ўзнаўленне парка Радзівілаў, які з'яўляецца выдатным помнікам эпохі Адраджэння. Падрыхтоўкай гэтага двухтыднёвага падарожжа займаецца студэнцкі аддзел Мінскага гаркома БСМ.

*Валерыя АЎСЯНІК*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## СТАТЫСТЫКІ ЯДНАЮЦЦА

***8-12 чэрвеня на базе БДУ пройдзе пятая міжнародная навуковая канферэнцыя "Камп'ютэрны аналіз дадзеных і мадэліраванне". Рыхтуе яе факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі сумесна з Беларускай статыстычнай асацыяцыяй (БСА), створанай 18 сакавіка гэтага года.***

БСА прызваная аб'яднаць спецыялістаў, якія займаюцца правядзеннем навуковых даследаванняў у тэарэтычнай статыстыцы і яе прымяненнях у эканоміцы, тэхніцы, медыцыне, экалогіі, сацыялогіі, псіхалогіі і іншых галінах. Асноўнай мэтай БСА з'яўляецца папулярызацыя статыстычных ідэй, развіццё метадаў і пашырэнне сферы прымянення статыстыкі ў прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навуках, каардынацыя навуковых даследаванняў, а таксама забеспячэнне эфектыўнага ўзаемадзеяння ў галіне тэарэтычнай і практычнай статыстыкі, накіраваныя на росквіт беларускага грамадства.

У свеце цяпер існуе каля 50 нацыянальных статыстычных асацыяцый. Іх дзейнасць каардынуе Міжнародны статыстычны інстытут. Прэзідэнтам Беларускай статыстычнай асацыяцыі абраны загадчык кафедры матэматычнага мадэліравання і аналізу дадзеных БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Ю. С. Харын.

Бліжэйшымі задачамі БСА з'яўляюцца выданне інфармацыйнага бюлетэня БСА, стварэнне WWW-старонкі, арганізацыя рэспубліканскіх семінараў па тэарэтычнай і практычнай статыстыцы, арганізацыя лекцый, якія будуць чытаць вядучыя вучоныя-статыстыкі з розных краін свету, правядзенне выстаўкі і кансультацый па статыстычнаму праграмнаму забеспячэнню.

БСА запрашае зацікаўленых выкладчыкаў, нвуковых супрацоўнікаў і студэнтаў да супрацоўніцтва.

*Ірына ШКЛЯР*

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## ДЫПЛОМ НАВУЧАННЮ НЕ ПЕРАШКОДА

*З кожным годам колькасць жадаючых атрымаць вышэйшую адукацыю павялічваецца. Дзяржава не ў стане забяспечыць навучанне ўсіх ахвотных за кошт бюджэтных сродкаў. Таму вось ужо шосты год вышэйшую адукацыю можна атрымліваць за ўласныя грошы, сродкі дзяржаўных арганізацый і прадпрыемстваў і з дапамогай спонсараў розных формаў уласнасці. Калі ў 1992 годзе ў ВНУ рэспублікі на платную форму навучання паступіла менш за 4000 чалавек, то ў 1997 гэтая лічба перавысіла 15000. Нічога дзіўнага — увесь свет імкнецца да ведаў. У Японіі, напрыклад, вышэйшую адукацыю хутка зробяць абавязковай.*

*Апошнім часам з'явілася і шмат жадаючых атрымаць другую вышэйшую адукацыю. У 1997 годзе людзей з вышэйшай адукацыяй, якія зноў паступілі ў ВНУ, было 105 (для параўнання: у 1996 годзе гэтая лічба не перавышала 50-ці). Ёсць людзі, якія атрымоўваюць трэцюю і нават чацвёртую. Але такія выпадкі адзінкавыя.*

*Механізм гэтага працэсу нам дапамагае раскрыць намеснік начальніка Упраўлення вышэйшай адукацыі Браніслаў Віктаравіч ДАШКЕВІЧ.*

— Заканадаўча працэс атрымання другой вышэйшай адукацыі рэгулюе Палажэнне "Аб парадку атрымання другой вышэйшай адукацыі ў вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь". Яно было зацверджана літаральна ў мінулым годзе. Раней другая вышэйшая адукацыя была амаль выключэннем. Напрыклад, калі ў школе не хапала настаўнікаў матэматыкі, а было шмат філолагаў, да нас звярталіся па дазвол скончыць яшчэ адну ВНУ — своеасаблівая перападрыхтоўка, якая была бясплатнай.

**— А цяпер?**

— Другую вышэйшую адукацыю можна атрымаць, калі ёсць дыплом аб заканчэнні ВНУ (гэта паслядоўнае навучанне) ці калі студэнт паспяхова (на "добра" і "выдатна") вучыцца на 3-4 курсах у ВНУ (паралельнае навучанне). Толькі за гэта давядзецца поўнасцю заплаціць.

**— А калі першую вышэйшую адукацыю нехта атрымліваў за грошы?**

— Тады ў яго ёсць магчымасць атрымаць другую за бюджэтныя сродкі. Толькі паступаць ён будзе ўжо на конкурснай аснове, згодна з правіламі прыёму ў ВНУ. І пры гэтым на другі ці старэйшыя курсы яго залічаць толькі пры наяўнасці вакантных студэнцкіх месцаў.

**— Ці ёсць катэгорыі грамадзян, якія ў любым выпадку могуць вызваляцца ад аплаты?**

— Так, ёсць ільготныя катэгорыі. Гэта воіны-інтэрнацыяналісты, сіроты (пры паралельным навучанні), асобы, якім супрацьпаказана праца па атрыманай раней спецыяльнасці ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя пры наяўнасці заключэння медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі, супрацоўнікі праваахоўных органаў, якія паступаюць у ведамасныя ВНУ, калі атрыманне другой спецыяльнасці выклікана службовай неабходнасцю.

**— Ці прадугледжвае атрыманне другой вышэйшай адукацыі абавязковы поўны курс навучання?**

— Не, канешне. Калі вы скончылі журфак і вырашылі навучацца на філфаку, то шмат у чым змест дысцыплін, якія вы праходзілі, будзе адпавядаць патрабаванням падрыхтоўкі філолага. У такіх выпадках навучанне можна пачынаць з пэўнага курса ці семестра. Тады ўжо вывучаныя дысцыпліны будуць проста перазалічвацца.

**— Ці можа быць зніжана плата за атрыманне другой вышэйшай спецыяльнасці?**

— Так. Памер платы можа быць перагледжаны ВНУ, як правіла, пасля заканчэння семестра ці, адпаведна, курса ў сувязі з аб'ектыўнымі прычынамі, пералік якіх павінен быць уключаны ў дагавор паміж ВНУ і юрыдычнай ці фізічнай асобай.

*Валерыя АЎСЯНІК*

# Паверыць у казку бывае так проста...

Сапраўдным святам прыгажосці, элегантнасці, грацыі і маладосці стаў шоў-конкурс "Міс Белдзяржуніверсітэт-98", які праходзіў напрыканцы красавіка ў вядучай ВНУ рэспублікі. На працягу двух месяцаў 60 самых прыгожых студэнтак амаль з усіх факультэтаў БДУ вялі ўпартую барацьбу за права трапіць у лік 16 фіналістак. А перамагла ў заключным конкурсе і стала ўладальніцай ганаровага тытула студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Святлана Латышава, якая атрымала ад аднаго са спонсараў шоў — турыстычнай фірмы "Туссон" — семідзённую пуцёўку ў сталіцу Францыі.



У сценах старэйшай ВНУ краіны, дзе вучацца тысячы студэнтак з усёй Беларусі, фінал конкурса праходзіў на ўзроўні, нікольki не ніжэйшым за міжнародны. Гасцямі і актыўнымі ўдзельнікамі студэнцкага фестывалю прыгажосці былі зорка беларускай эстрады Інна Афанасьева, бліскучы танцавальны дуэт "Француз и его подруга" з Санкт-Пецярбурга, добра вядомыя ў рэспубліцы выканаўцы бальных танцаў Алена і Васіль Ляшэнкі, спявачка Маладзёжнага тэатра эстрады Наталля Варанец. У журы конкурса працавалі прэзідэнт мадэльнага агенцтва Аляксандр Варламаў, папулярная вядучая Беларускага тэлебачання Алена Спірыдовіч, намесніца дырэктара Нацыянальнай школы прыгажосці Наталля Траян і іншыя. Варта дадаць да гэтага выказанае ўслых слушнае меркаванне старшыні журы шоў-конкурса, рэктара БДУ Аляксандра Казуліна, што беларускія дзяўчаты бадай што найпрыгажэйшыя ў Еўропе, дый за яе межамі.

Дарэчы, студэнткі з 9 факультэтаў, што прабіліся ў фінал, з першых жа хвілін прадстаўлення, якое вёў першакурснік Максім Дубовік, пачалі даказваць гэта не толькі з дапамогай слоў, але і значна больш пераканаўчымі сродкамі.

Цалкам прывабіць да сябе ўвагу гледачоў, а галоўнае патрабавальных членаў журы з дапамогай натхнёна сказанага слова, прымусіць забыцца пра ўсё празаічнае і на некалькі імгненняў паверыць у казку — відаць, такой мэты імкнуліся дасягнуць у час сваіх выступленняў удзельніцы конкурса "Міф пра сябе". Наогул, вельмі складана расказаць пра асноўныя рысы абранага іміджу за паўхвіліны. Але немагчымае раптам станавілася магчымым, на вачах у зачараванай залы модныя прыгажуні ператвараліся хто ў снежную каралеву, хто ў рамантычную зорку на небасхіле, а хто і ў гарэзлівае чарцяня. Яскравых, пераканаўчых характарыстык саміх сябе было столькі, што неўзабаве ясным заставалася літаральна адно: у вытанчаным спаборніцтве красамоўства панавала, як заўважыла адна з удзельніц, "усяго толькі жанчына, усяго толькі вечнасць".

Надзвычай непадобнымі, але нязменна прывабнымі выглядалі ўдзельніцы наступных чатырох конкурсаў — "Беларускія матывы", "Джынсавая вечарына", "Грацыя" і "Баль". Касцюмы з нацыянальнымі матывамі, пашытыя і аздобленыя ўзорамі і вышыўкамі ў фірме "Скарбніца", здаецца, як найлепей пасавалі прыгожым і стройным студэнткам універсітэта, а калі паглядзець як след праўдзе ў вочы — дык вылітым фотамадэлям, якім пазайздросціць любы модны часопіс. Але дзе ж падзелася акадэмічная стрыманасць гледачоў, калі дзяўчаты выйшлі на подыум у купальніках фабрыкі "Мілавіца"? А якімі гарэзлівымі і гнуткімі, пластычнымі і суперсучаснымі выглядалі "актывісткі і спартсменкі", дэманструючы калекцыю джынсавага адзення з салона-магазіна "Каррэра"!.. Здаецца, уся зала пачала прыходзіць у прытомнасць пасля гэтага сапраўды феерычнага відовішча пад гукі рытмічнай музыкі толькі падчас дэманстрацыі калекцыі вечаровых строяў у заключным конкурсе "Баль". Тады, мусіць, не аднаму дзесятку гледачоў здавалася, што больш цяжкой і складанай работы, чым у журы, на свеце няма.

Але там, дзе маглі б разгубіцца аматары, прафесіяналы толькі пацвярджаюць высокі клас і дэманструюць тонкі густ. Журы шоў-конкурса вызначыла лепшых з лепшых, а яго старшыня, рэктар БДУ Аляксандр Казулін, уручыў Святлане Латышавай атрыбуты ўлады першай прыгажуні універсітэта — карону ад фірмы "Скарбніца", прыгожа вытканую стужку з надпісам "Міс Белдзяржуніверсітэт-98" і зіхоткі, з залацістым бляскам плашч. Наталля Ласіца (біялагічны факультэт) і Ірына Калініна (факультэт журналістыкі) сталі пераможцамі ў намінацыі "віцэ-міс Белдзржуніверсітэта". Ганне Сяргеевай з біялагічнага факультэта прысуджаны тытул "міс фота", а студэнтка факультэта міжнародных адносін Галіна Вараб'ёва перамагла ў конкурсе на званне "Міс сімпатый гледачоў".

Двухмесячны марафон, у якім спаборнічалі між сабой універсітэцкія прыгажуні, атрымаў добрае завяршэнне. Поспехам ён быў абавязаны ў многім намаганням людзей, якія працавалі, як кажуць, "за кадрам". Дзякуючы актыўнаму ўдзелу ў падрыхтоўцы шоў-конкурса прарэктараў БДУ У. Аджаева і С. Чайкуна, дружнай каманды дырэкцыі па справах культуры на чале з У. Макарэвічам і многіх іншых ён стаў не толькі святам універсітэцкага ўзроўню, але і прыкметнай падзеяй у культурным жыцці горада і рэспублікі.

***Пётр ДАРАШЧОНАК***

А Ў ВАС? А Ў НАС!

## Свята фізікаў

У красавіку ў дваццаць чацвёрты раз на факультэце фізікі БДУ адбылося самае любімае студэнцкае свята — Дні фізіка.

Неад'емнымі атрыбутамі гэтых дзён сталі мітынг-шэсце, атракцыёны, аўкцыён "у цёмную", канцэрт-пасвячэнне ў першакурснікі. У якасці дэсерту быў прыпаднесены капуснік.

Выступалі таксама студэнцкія тэатры эстрадных мініяцюр. У гэтым годзе яны былі прадстаўлены беларускімі тэатрамі ЧП, Беларускі вакзал, Рэпа, а таксама СТЭМы, якія прыехалі па традыцыі з Масквы, Навасібірска, Харкава і Казані.

Агульны святочны настрой на гэтыя дні зрабіў роўнымі ўсіх. Нават дэкан факультэта не ўтрымаўся і прыняў удзел у адным з атракцыёнаў.

***Аляксандр ІНІН***

## Не ладзяць з ПДД

У 1998 годзе дарожная дысцыпліна нікольki не палепшылася. У параўнанні з такім жа перыядам мінулага года парушэнні пешаходаў павялічыліся болей чым на 10 працэнтаў.

За першы квартал зарэгістравана 20 566 парушэнняў Правілаў дарожнага руху. Толькі ў сакавіку за парушэнне ПДД пакарана больш 6 тысяч пешаходаў.

Супрацоўнікі і студэнты БДУ у гэтым сумным спісе, на жаль, не на апошнім месцы. За кіраванне транспартам у нецвярозым стане затрыманы студэнт А. Горцаў.

Былі затрыманыя і пакараныя за перавышэнне хуткасці супрацоўнікі Г. Піцэвіч і І. Хомічаў, а таксама студэнты Д. Янкоўскі, Ж. Астроўская, Л. Мартынюк, У. Арлоўскі. Не лічаць неабходным выконваць ПДД студэнты Д. Ходас, А. Свістун.

***М. СКІПАР,***
***дзяржаўтаінспектар ДАІ***

ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

# "ТАТА ВЫРАТАВАЎ НАМ ЖЫЦЦЁ..."

Адным з заснавальнікаў беларускай школы фізікаў з'яўляецца прафесар БДУ Ілья Рыгоравіч Некрашэвіч. Менавіта пад яго кіраўніцтвам былі распачаты і атрымалі шырокую вядомасць даследаванні па фізіцы плазмы і розных аспектах яе выкарыстання. У 1961 годзе Ілья Рыгоравіч быў узнагароджаны ордэнам Леніна, а 1972 прафесару надалі званне Заслужанага дзеяча навукі БССР. Уласную навуковую школу Некрашэвіч стварыў не толькі ў Беларусі, але і ў сваёй сям'і: дачка Мая стала кандыдатам медыцынскіх навук, а сын Яраслаў — кандыдат фізіка-тэхнічных навук.

Вось ужо пяць гадоў, як І. Р. Некрашэвіча не стала. Яго як чалавека і фізіка добра памятаюць многія навукоўцы. Але мала хто ведае, што Ілья Рыгоравіч быў партызанам.

*— Ён не хацеў працаваць у немцаў, супрацоўнічаць. Але я пераконвала, што нам патрэбны людзі ва ўсіх нямецкіх установах, што, ведаючы нямецкую мову, ён зможа нам дапамагчы...*

Герой Савецкага Саюза Марыя Барысаўна Восіпава, кіраўнік Мінскай падпольнай групоўкі, членам якой з'яўляўся І. Р. Некрашэвіч, да гэтага часу памятае Ілью Рыгоравіча як аднаго з самых сумленных людзей.

Напярэдадні вайны І. Р. Некрашэвіч ужо быў загадчыкам кафедры агульнай фізікі БДУ. Правёў першыя даследаванні па фізіцы звышфазавых частот, па фізіцы паўправаднікоў і па вывучэнню з'яў у кропкавых кантактах метал-паўправаднік. Чалавек цікаўны, шырокіх інтарэсаў, у свае 36 гадоў ён упэўнена рухаўся наперад, да новых перамог. Але пачалася вайна, і ўсё пайшло па-іншаму.

Спроба эвакуіравацца на ўсход, не маючы транспартных сродкаў, скончылася няўдала. Ілья Рыгоравіч з сям'ёй быў вымушаны застацца на акупіраванай тэрыторыі.

Мая Ільінічна Некрашэвіч, якой тады было 11 гадоў, успамінае, як яе шыракаплечы, спартыўнага выгляду бацька нёс на плячах двухгадовага сына:

*— Ніхто не думаў, што давядзецца бегчы з дому. Ішлі з упэўненасцю, што вось-вось з'явяцца нашы і вызваляць усіх.*

У ліпені 1941 года Ілья Рыгоравіч увайшоў у падпольную арганізацыю і па заданню М. Б. Восіпавай уладкаваўся ў нямецкі Кліматычны інстытут у Мінску. Вось што прыгадвае наконт гэтага Марыя Барысаўна:

*— Ну, як ён працаваў? Ён проста шкодзіў! Псаваў абсталяванне. Яго абавязкам было складаць метэазводкі для нямецкай авіяцыі. Ілья іх заблытваў: усе зводкі паказвалі не тое. І яго аднойчы папярэдзілі: "Расстраляем!" Ілья і кажа, што, маўляў, дрэнна валодае тэхнікай, не можа ў ёй разабрацца. А немец у адказ: "Ведаю я такіх: нічога не разумеюць, да працы не здольныя, а ўсё ў іх тэхніка вінавата!"*

Сам Некрашэвіч пісаў пра гэтую "працу": "Здабытыя матэрыялы (дэталі і батарэйкі сілкавання для партызанскіх радыёпрыёмнікаў, карты Мінска і яго навакольля, зводкі з франтоў, што зрэдку шанцавала падслухаць па нямецкім радыёпрыёмніку) непасрэдна выносіліся мною, або па іх прыходзіла 12-гадовая дачка М. Восіпавай Тамара, якая быццам бы прыносіла для мяне прадукты харчавання. Усё гэта трэба было рабіць з найбольшай асцярожнасцю, загадзя вывучыўшы "характар" немцаў, якія дзяжурылі каля выхаду з інстытута: некаторыя з іх не абцяжарвалі сябе вобыскам кожнага, і ведаючы, калі хто з іх дзяжурыць, можна было з меншай рызыкай выходзіць са "здабычай".

Трэба было заводзіць знаёмствы з ваеннымі немцамі, якія працавалі ў інстытуце, асцярожна наводзіць іх на патрэбныя тэмы размовы, з выпадкова сказаных фраз будаваць высновы аб патрэбных табе звестках. Так удавалася даведацца, у прыватнасці, аб перадыслакацыях некаторых ваенных часцей, пра што неадкладна паведамлялася "па ланцужку" праз М. Восіпаву ў лясныя атрады, а адтуль — далей праз фронт..."



*І. Р. НЕКРАШЭВІЧ (першы злева) з сястрой і братам.*

Займаўся Некрашэвіч і іншымі справамі. У гарадской управе працаваў Мікалай Крэчатовіч, таксама падпольшчык, які здабываў метрыкі і бланкі савецкіх пашпартоў. А Ілья Рыгоравіч падпісваў іх і падрабляў пячаткі. Дакументы гэтыя прызначаліся для ваеннапалонных, якім пашчасціла выратавацца з лагеру смерці, што знаходзіўся ў раёне Масюкоўшчыны. Ілья Рыгоравіч дзяліўся з уцекачамі адзеннем, даваў ім прытулак і загадзя падрыхтаваныя дакументы. А потым дапамагаў выйсці з горада. Яго жонка, Ганна Мікалаеўна Шымановіч, афіцыйны доктар вёскі Аляксееўка, была "партызанскім доктарам": перадавала медыкаменты, лячыла хворых. Яе бацькі жылі недалёка ад Мінска і вёсцы Цялякова. Вось яны і дзяліліся вопраткай з Ільёй Рыгоравічам, які ўсё часцей і часцей "абношваўся".

М. Б. Восіпава ўспамінае, што ён быў адданы справе:

*— Я аднойчы нават пасварылася на яго. Сказала, як гэта можна так не думаць пра сям'ю: два дні трымаў на кватэры медыкаменты, маючы такіх ненадзейных суседзяў! Ён сказаў, што не мог іначай.*

М. І. Некрашэвіч:

*— Каля Аляксееўкі стаяў гарнізон літоўскіх і ўкраінскіх паліцаяў. Аднойчы прыйшоў літовец і папярэдзіў, каб мы збіралі рэчы, бо ў хуткім часе нашу сям'ю возьмуць. Мы сабралі рэчы, пакідалі на воз і павольна і павольна паехалі па вёсцы. Ніхто не данёс — такой павагай карысталася мая маці. Мы без перашкод трапілі ў партызанскую зону. Гэта было ў кастрычніку 1944 года. У партызанскім атрадзе імя Молатава II партызанскай брыгады мой бацька стаў радавым байцом, а маці — доктарам.*

*Перад тым, як адыходзіць, немцы вырашылі зрабіць аблаву ў партызанскай зоне. Трэба было хавацца, ісці праз дрыгву. А гэта па сілах толькі мужчынам. Куды падзецца старым, жанчынам, дзецям, што жылі ў партызанскім пасёлку? Некаторыя палічылі, што немцы — культурны народ: у дзяцей страляць не будуць. Таму частка засталася на сваіх месцах. Мой бацька вырашыў не спадзявацца на лёс, і перад тым, як ісці ў лес, добра нас схаваў. Ён быў майстар на ўсе рукі і ў крытычнай сітуацыі не згубіў сваю кемлівасць: ля пасёлку, пры самай дарозе, дзе рос хмызняк, зрабіў схавішча. Выкапаў яміну (пясок і зямлю адносіў далёка і пільна сачыў, каб не засталося ніякіх рэштак), зверху заклаў яе мохам і замаскіраваў елачкай. А каб нам было чым дыхаць, зрабіў у пні, які тырчаў у гэтым месцы, адтуліну, па якой ішло паветра. Бацька не ведаў, колькі нам давядзецца чакаць. Таму з аднаго боку край ямы быў ніжэйшы, з заглыбленнем, куды з балота прасочвалася вада для піцця. Ніхто не падазраваў пра гэтае схавішча, бацька пасадзіў туды нас і яшчэ адну жанчыну з дзіцём, прыкрыў імхом і пайшоў у лес...*

*... Мой брат кашляў, і маці закрывала яму рот падушкай, каб не было чуваць, бо зусім блізка чуліся стрэлы і нямецкая гаворка. Праз тры дні мы адважыліся выпаўзці паглядзець: усе, хто заставаўся ў вёсцы, былі забіты. І дзеці, і старыя. А ля нашага схавішча ляжалі гільзы — тут быў агнявы пункт немцаў. Бацька разлічыў правільна. Мы былі зусім блізка, і ніхто не падумаў, што ў хмызняку пры дарозе хаваюцца пяць чалавек. Тата выратаваў нам жыццё...*

Пасля вайны Марыя Барысаўна Восіпава настаяла, каб Ілья Рыгоравіч узяў даведку аб сваёй прыналежнасці да партызанаў. Ён лічыў гэта лішнім: "Усе і так ведаюць". Ведалі ўсе, але калі давялося...

Прысудам гучалі словы "быў у акупацыі". І на Некрашэвіча напісалі данос. Калі б не М. Б. Восіпава, магчыма, ні ён сам, ні яго сям'я не засталіся б тады жывымі...

... У 45 гадоў Ілья Рыгоравіч пачаў скардзіцца на сэрца. Доўга не маглі зразумець, чаму ў такога моцнага, фізічна падрыхтаванага чалавека, які займаўся спортам і вёў здаровы лад жыцця, раптам выявілася арытмія. І вось Мая Ільінічна, урач па прафесіі, успомніла, што ўсю вайну яе бацька насіў каля сэрца ампулу з пяццю міліграмамі радыю. Гэта была універсітэцкая каштоўнасць, і Ілья Рыгоравіч палічыў злачынствам пакінуць яе ворагам. У пасляваенны час гэтая ампула стала адзінай крыніцай радыяактыўных промняў, на ёй было выканана больш за дваццаць студэнцкіх дыпломных работ.

***Валерыя АЎСЯНІК***

# Калі “Еўра” будзе ў нашых кішэнях?

*Старшыня Еўрапейскага савета, прэм’ер-міністр Вялікабрытаніі Тоні Блэр абвясціў аб рашэнні спецыяльнага саміта ЕС стварыць Эканамічны і Валютны саюз. З 1 студзеня 1999 года ў ім аб’ядноюцца 11 з 15 краін ЕС: Бельгія, Нідэрланды, Люксембург, Германія, Францыя, Італія, Іспанія, Партугалія, Ірландыя, Аўстрыя і Фінляндыя. Мы прапануем увазе чытачоў “Беларускага універсітэта” заканчэнне серыі артыкулаў, надрукаваных пад гэтым жа загалоўкам у папярэдніх нумарах газеты (за 26 лютага і 12 сакавіка).*

**Якія перавагі мае адзіная валюта?**

Пераваг мноства. Для аднаго адзіная валюта азначае, што пры паездках па Супольнасці больш не трэба будзе займацца абменам грошай і несці страты на кожнай аперацыі, як гэта зараз адбываецца. Абменная розніца і камісія за паслугі банка проста знікнуць. У прыватнасці, палепшыцца становішча малога бізнеса, паколькі плацяжы і пераводы паміж дзяржавамі-членамі стануць больш аператыўнымі і надзейнымі, а таксама больш таннымі.

Для бізнесу і спажыўцоў адзіная валюта прынясе ўпэўненасць адносна цаны, па якой прадаюцца тавары. Раней было так, што нечаканыя змены курсаў канвертацыі маглі за некалькі гадзін забраць усе прыбыткі.

Больш таго, калі тавары і паслугі ацэньваюцца ў адной і той жа валюце, будзе значна ўзмоцнены эфект канкурэнцыі адзінага рынку, што спрыяе дзейнасці Супольнасці ў цэлым. У гэтых абставінах адзіная валюта дапаможа стымуляваць рост і працоўныя месцы.

Пераход да адзінай валюты будзе азначаць, што нацыянальныя ўрады будуць мець больш ўплыў на эканамічную палітыку іншых, а таксама на змены працэнтных ставак. Адзіная валюта дазволіць больш упэўнена стрымліваць ціск, які раней ажыццяўляўся на асобныя нацыянальныя валюты з боку спекулянтаў. Гэта таксама паспрыяе прадказальнасці ў працэнтных стаўках.

**Як будзе Еўра суіснаваць з іншымі валютамі краін-членаў, якія спачатку не прымуць адзіную валюту?**

Мадрыдскі Еўрапейскі Савет вырашыў зрабіць аналіз адносін паміж дзяржавамі-членамі, якія прымуць Еўра з самага пачатку (ins), і тымі, што далучацца да зоны Еўра пазней (pre-ins).

Гэтая праблема была ў цэнтры ўвагі на пасяджэнні Савета (эканамічныя і фінансавыя пытанні) у Вероне 13 красавіка 1996 года. Там быў дасягнуты кансенсус адносна неабходнасці захаваць валютную стабільнасць у інтарэсах належнай дзейнасці адзінага рынку.

Міністры таксама аднагалосна зацвердзілі прапанову Камісіі па ўзмацненню шматбаковага кантролю.

Аднак большасць дзяржаў-членаў пагадзілася з тым, што такое ўзмацненне не будзе дастатковым для забеспячэння валютнай стабільнасці, таму што рынак часам дзейнічае з улікам не толькі эканамічных законаў, але і іншых фактараў. Узнікае патрэба у механізме абменных курсаў; ні адна дзяржава-член не выступіла супраць стварэння такога механізма.

У 2002 годзе Еўра замяніць нацыянальныя банкноты і манеты ў тых краінах, якія ў 1999 годзе выканаюць эканамічныя ўмовы для ўдзелу ў адзінай валюце.

Канкрэтныя дамоўленасці для гэтай перагледжанай ЕВС трэба яшчэ выпрацаваць, але яе базавыя прынцыпы былі ўжо ўзгоднены:

— pre-ins далучаюцца да зоны Еўра на тых жа ўмовах, што і першыя ўдзельнікі;

— сістэма павінна быць прывабнай і прапаноўваць актыўную валютную салідарнасць;

— сістэма мае быць гібкай і ўлічваць розныя ступені канвергенцыі, асабліва з улікам пашырэння Супольнасці ў будучым;

— дзейнасць сістэмы не павінна наносіць урон мэце цэнавай стабільнасці, да якой імкнецца Еўрапейскі цэнтральны банк.

Праца працягваецца з тым, каб агульная архітэктура сістэмы была завершана ў канцы 1996 года. Даклад аб дасягнутым прагрэсе быў прадстаўлены кіраўнікам дзяржаў і ўрадаў на Еўрапейскім Савеце ў Фларэнцыі (21 і 22 чэрвеня 1996 года).

**Як будзе інфармавацца грамадскасць аб адзінай валюце?**

Увядзенне Еўра будзе першай акцыяй, калі еўрапейская інтэграцыя закране ўсіх членаў грамадскасці ў іх штодзённым жыцці. Новая валюта павінна быць прынятай ва ўсім спектры еўрапейскай грамадскай думкі. Для вырашэння гэтай важнай задачы ў студзені 1996 года ў Бруселі быў арганізаваны круглы стол з удзелам прадстаўнікоў усіх галін эканомікі, усіх слаёў грамадства з 15 дзяржаў-членаў для распрацоўкі адпаведных ініцыятыў. З улікам вынікаў круглага стала 25 красавіка 1996 года Камісія пачала рэалізацыю плана камунікацыі, які быў заснаваны на трох галоўных прынцыпах:

— акцыі павінны быць дэцэнтралізаванымі, з тым каб улічваць розную нацыянальную спецыфіку: у Францыі, напрыклад, Еўра часта асацыіруюць з ідэяй эканоміі, а ў Германіі Еўра выклікае страх страты ашчаджэнняў. Таму інфармацыю трэба даводзіць з улікам розных сітуацый;

— неабходна стварыць дух партнёрства на розных узроўнях правядзення акцый: еўрапейскім, нацыянальным і лакальным, трэба аб’яднаць дзяржаўныя органы, прафесійныя саюзы, арганізацыі спажыўцоў і прамысловасці;

— неабходна мець прагрэсіўны план з адпаведнымі прыярытэтамі. На гэтым этапе не мае сэнсу асвятляць людзям практычныя дамоўленасці па замене банкнот і манет, таму што гэты працэс адбудзецца праз пяцьшэсць гадоў. З другога боку, ёсць пэўная неабходнасць накіраваць інфармацыю тым, да каго заўсёды звяртаюцца людзі: банкам, прамысловым федэрацыям і прафесійным саюзам, сацыяльным органам, настаўнікам і фінансавым структурам. Маючы гэта на ўвазе, Камісія рыхтуе агульную базу дадзеных, якую можна знайсці ў Інтэрнэце, і публікуе ўсю фактычную інфармацыю, тлумачэнні і аргументы, патрэбныя вышэйзгаданым арганізацыям для таго, каб члены грамадства маглі атрымаць неабходную інфармацыю там, дзе яны яе шукаюць (напрыклад, у офісах банкаў).

**Хто ёсць хто для Еўра?**

1999 год: увядзенне адзінай валюты.

Хто будзе адказны за эканамічную і валютную палітыку Саюза? Адказнасць размеркавана наступным чынам:

**Эканамічная палітыка: Савет на першым плане**

Эканамічная палітыка 15 дзяржаў-членаў будзе каардынавацца, як і зараз, праз Савет міністраў фінансаў і эканомікі ЕС:

— Савет кожны год працягвае распрацоўку і прыняцце галоўных накірункаў эканамічнай палітыкі (агульныя мэты па інфляцыі, публічныя фінансы і стабільнасць абменных курсаў);

— Савет прымае рашэнні аб тым, ці існуе празмерны дэфіцыт у краіне, якая далучылася да зоны Еўра, і калі так — накіроўвае рэкамендацыі адпаведнай краіне, з тым каб вырашыць гэтую праблему;

